УДК 811.161.3’373

*І. М. Яраш*

# УЛАСНА НАМІНАТЫЎНАЯ ФУНКЦЫЯ ІНДЫВІДУАЛЬНА-АЎТАРСКІХ НЕАЛАГІЗМАЎ У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

*У артыкуле разглядаюцца індывідуальна-аўтарскія неалагізмы, утвораныя з мэтай рэалізацыі ў сучасных паэтычных творах уласна намінатыўнай функцыі – назвы новай або перайменавання старой рэаліі. Праведзены аналіз фактычнага матэрыялу дазволіў вылучыць паводле намінацыі чатыры групы індывідуальна-аўтарскіх неалагізмаў: а) абазначэнне новай рэаліі, якая не мае яшчэ намінацыі ў мове; б) перайменаванне старой рэаліі (індывідуальна-аўтарскі неалагізм выступае як сінонім узуальнага слова); в) аднаслоўнае найменаванне рэаліі, якая да гэтага часу абазначалася апісальнымі канструкцыямі; г) назва выдуманай рэаліі, якой на самой справе не існуе.*

## Уводзіны

Неалагізмы сталі аб’ектам пільнай увагі лінгвістаў прыкладна з 60-х гадоў XX стагоддзя. Традыцыйна пры іх даследаванні выкарыстоўваецца сістэмна-структурны падыход. Так, пытанні паходжання, утварэння і семантыкі новых слоў разглядаюцца ў працах А. Земскай, А. Лыкава, Р. Намітокавай, І. Улуханава, Г. Басавай, М. Прыгодзіча, А. Солахава, М. Шабовіча і інш. Актуальным застаецца пытанне аб функцыянальным прызначэнні неалагізмаў. У многіх даследаваннях у залежнасці ад мэты ўтварэння неалагізмы падзяляюцца на намінатыўныя і экспрэсіўныя. Першыя выконваюць у мове намінатыўную функцыю, г. зн. называюць новую рэалію, другія даюць вобразную характарыстыку прадметам, якія ўжо маюць назву. Некаторыя даследчыкі лічаць, што індывідуальна-аўтарскія новаўтварэнні пазбаўлены намінатыўнай функцыі (М. Фаміна) або гэта функцыя аслаблена. Так, А. Лыкаў сцвярджае, што галоўнай для узуальных слоў з’яўляецца намінатыўная функцыя, а для аказіянальных – экспрэсіўная, таму лексічны аказіяналізм не столькі намінатыўны, колькі экспрэсіўны [1, 27]. Гэтай пазіцыі прытрымліваецца і Р. Намітокава, якая лічыць, што патрэбна адмовіцца ад тэрмінаў «намінатыўны» і «экспрэсіўны» пры выяўленні канкрэтных функцый аўтарскіх неалагізмаў у мастацкім тэксце [2, 30].

У гэтым пытанні найбольш слушную думку, на наш погляд, выказвае А. Земская: неалагізмы, у тым ліку індывідуальна-аўтарскія, могуць выконваць і намінатыўную, і экспрэсіўную функцыі [3, 203]. Намінатыўная функцыя вылучаецца і сучаснымі даследчыкамі функцыянальнага аспекта індывідуальна-аўтарскіх неалагізмаў. Так, Н. Міронава, даследчык творчасці паэтаў-мадэрністаў, экспрэсіўнасць прызнае галоўнай прыметай аказіянальнага слова і разам з тым вылучае асобна намінатыўную функцыю як абазначэнне рэаліі або паняцця, выражэнне якіх у мове магчыма толькі ў выглядзе апісальных канструкцый [4, 13]. В. Бышук пры даследаванні функцый аўтарскіх дэрыватаў С. Кржыжаноўскага таксама звяртае ўвагу на намінатыўную функцыю новаўтварэнняў і выдзяляе тры групы абазначэнняў: назвы новых рэалій, сінонімы узуальных слоў, найменні выдуманых асоб, прадметаў, з’яў [5, 16]. У класіфікацыі А. Грышчавай намінатыўная і экспрэсіўная функцыя з’яўляюцца падтыпамі прагматычнай функцыі аказіянальных слоў. Пры гэтым даследчык асобна вылучае ўласна намінатыўную падфункцыю намінатыўнай функцыі [6, 10].

## Вынікі даследавання і іх абмеркаванне

На нашу думку, індывідуальна-аўтарскія неалагізмы – маўленчыя навятворы, якія адзначаюцца толькі ў пісьмовым тэксце, не фіксуюцца ў слоўніках нацыянальнай мовы, існуюць толькі ў тэксце і валодаюць прыметай незвычайнасці [2, 22], – не пазбаўлены намінатыўнай функцыі. У мове сучасных паэтычных твораў нярэдка сустракаюцца словы, утвораныя з мэтай назвы новай рэаліі, а не з мэтай узмацнення экспрэсіўнасці выказвання.

МГПУ им. И.П. Шамякина

Індывідуальна-аўтарскія неалагізмы, якія выконваюць намінатыўную функцыю, могуць абазначаць:

1) новыя рэаліі, якія не маюць яшчэ намінацыі ў мове: ***аграпаўтарэнне*** ‘паўтарэнне ведаў па апрацоўцы сельгасгаспадарчых культур‘, ***альтэрнатывісты*** ‘тыя, хто шукаюць альтэрнатывы ў якіх-н. пытаннях‘, ***баба-самасёлка*** ‘жанчына, якая самавольна дзе-небудзь пасялілася‘, ***негерой*** ‘звычайны чалавек, які нічым не вылучаецца‘, ***палітаматар*** ‘палітык, дзейнасць якога не перавышае аматарскага ўзроўню‘, ***рэхапрастора*** ‘прастора, напоўненая рэхам‘, ***самапаўтор*** ‘паўтарэнне самога сябе‘, ***урэчаісніць*** ‘зрабіць рэчаісным, рэальным‘, ***хмараход*** ‘рух хмар у небе‘: *Андрэеў друг – вучоны, Дырэктар запаведніка быў рады Параду даць, як трэба дбаць пра грады, Каб цэзій не падняў раслін карэнне, Ляжаў глыбока.* ***Аграпаўтарэнне*** *Назаўтра сын унікліва праводзіў...* (М. Мятліцкі); *Так, можа, калі-небудзь Зветраным ранкам У «рэтра» загоняць І Багдановіча з Танкам? А там, глядзіш, днём Ці, магчыма, і нанач Зняславяць і Белавежу, І Нарач... Шумяць, не сціхаюць Пад рокі і твісты На роднай зямельцы* ***Альтэрнатывісты*** (У. Карызна); *Бліжэй да ложка мкнецца кіцель шэры: – Арсен, глядзі ты,* ***баба-самасёлка****!* (Аўдоля) *– Да ўжэ ж, глядзіце... з етага пасёлка! Я тут жыла, ад’ехалася ў госці* (М. Мятліцкі); *Жыццё – адзіны валадар І радасці, і слёз, і мрояў. Геройскі ўчынак* ***негероя*** *– Не прапусціць чарговы ўдар* (Т. Бондар); *Вакола – рыцары насілля. Пераліцоўшчыкі вакол. Ці Беларусь – то, Ці Расія –* ***Палітаматараў*** *футбол* (Г. Пашкоў); *А рэха нямкое – знікае прастора... Зліваецца з рэхам: рэха – ў прасторы, прастора – у рэху...* ***Рэхапрастора*** (В. Рагаўцоў); *Зноў фарбы ночы нехта сцёр, І праяўляюцца абрысы, Бо кожны дзень –* ***самапаўтор****, Дзе ўсё імкнецца паўтарыцца* (Н. Гальпяровіч); *І Богу буду слаць маленні, Каб яркі імпульс стаўся вечным, І* ***ўрэчаісніў*** *наша сненне – Сагрэцца полымем сардэчным* (Т. Барысюк); *Ноч надзьмулася: Сухой наглыталася спёкі. А на небе – нямы* ***хмараход*** (Ю. Новік);

2) рэаліі, што маюць намінацыі ў мове, да якіх індывідуальна-аўтарскія неалагізмы выступаюць сінонімамі: ***вершатворца*** ‘*паэт*‘: *Любы ў вачах сваіх уласных – Пастаць! Дык не скажу, Што слухаць вас не варта – І* ***вершатворцу*** *юнага, І барда* (М. Кусянкоў); ***дужасіл*** ‘*асілак, волат*‘: *Вось узложжа ягонае – Саламонава: Шэсцьдзесят* ***дужасілаў*** *наўкол, Самых дужых Ізраелевых – Аж ад іх угінаецца дол* (Р. Барадулін); ***Жыццядар, Шчодрадаўца*** *‘Бог*‘: *Хлеб наш надзённы пашлі,* ***Жыццядар****, сёння нам*; *Веру ў адзінага Бога Айца, Усёўладара,* ***Шчодрадаўцу*** *дабра, Тварца ненасытнай зямлі І неба спадчыннага* (Р. Барадулін); ***кавярніца*** прапануецца аўтарам замест ‘*барменша*‘, ‘*афіцыянтка*‘: *Знікаю з павольнымі промнямі Туды, дзе аблокі цалуюцца, Дзе ты на знаёмай нам вуліцы чакаеш пагляду пяшчотнага. Адключыш на вечар свой сотавы. Цябе не пазнае* ***кавярніца****. Нам нашыя вобразы з’явяцца* (З. Арцюх); ***мільгавіца*** ‘*маланка*‘: *Спалошных крыл* ***мільгавіца*** *У стоенай вусцішы нетры* (М. Мятліцкі); ***нікацінства*** ‘*курэнне*‘: *Можа, прыгадаць дзяцінства, Скажам, перайсці на мох. Ды такое* ***нікацінства*** *Можа вас завесці ў морг* (К. Камейша); ***планецяне*** ‘*зямляне*‘: *– Што новага ў свеце? – І мы –* ***планецяне****! Хто з нас не «ваюе», з бутэлькі не цягне? Рабі справядліва! – душа не прыстане...* (С. Панізнік); ***пусталобы*** ‘*дурань, пустагаловы*‘: *Меціць Бог* ***пусталобых*** *Да сівой галавы. Лі кагор у вантробы, І – ні шум баравы* (В. Гардзей); ***радзімалюб*** ‘*патрыёт*‘: *Сум Сон-траву на чужыне скуб. Бязлітасны кон Нагрувашчваў хмары. А ён, зацяты* ***радзімалюб****, Спяшаўся ўзвесці Госпаду храмы* (Р. Барадулін); ***хлебасей*** ‘*хлебароб*‘: *Наднямонне годна стрэла сына, Бо не пан ён – Бачна па руках. Рукі чорныя, Нібыта ў* ***хлебасея*** (Я. Хвалей); ***цыцэронія*** ‘*красамоўства*‘: *І ваша* [аратараў] ***цыцэронія****, Як залаты запас, Як нашых дзён іронія, Праслаўляць вас і час* (Р. Тармола-Мірскі);

3) рэаліі, якія ў мове абазначаюцца апісальнымі канструкцыямі. Намінатыўная функцыя гэтых індывідуальна-аўтарскіх неалагізмаў спалучаецца з кампрэсіўнай: ***аднаклапатліўцы*** – ‘людзі, якія маюць аднолькавыя клопаты‘; ***анкетчык*** – ‘чалавек, які займаецца распрацоўкай анкет‘; ***арыштанцтва*** – ‘час знаходжання пад арыштам‘, ***бескароўе*** – ‘адсутнасць кароў‘; ***блуканец*** – ‘той, хто блукае, ходзіць у пошуках чаго-н.‘; ***бязгрыб’е*** – ‘адсутнасць грыбоў‘; ***бязмоўе*** – ‘адсутнасць мовы‘; ***бурштыніцца*** – ‘выглядаць як бурштын‘; ***вывівастасць*** – ‘здольнасць рабіць звілістыя рухі‘; ***высцяжыны*** – ‘след ад руху змея‘; ***гулажнік*** – ‘чалавек, які адбываў тэрмін пакарання ў ГУЛАГу‘; ***дыманосны*** – ‘які нясе дым‘; ***запарожцаўласнік*** ‘уласнік «Запарожца»‘; ***запісоўка*** – ‘запісная кніжка‘; ***зямшар*** ‘зямны шар‘; ***інфарктнік****-нябога* – ‘чалавек, які атрымаў

МГПУ им. И.П.Шамякина

інфаркт‘; ***пляжніца*** – ‘жанчына, якая бавіць час на пляжы‘; ***юбілеіць*** ‘адзначаць юбілеі‘; ***яблыкапад*** – ‘апад яблыкаў‘: *Чаго мне быць валачомнай датклівіцай Каля статкаў* ***аднаклапатліўцаў*** *тваіх?* (Р. Барадулін); *Хаця калі грунтоўна пакумекаць, Дык варт сказаць* ***анкетчыку*** *таму ж, Быў за мяжой і я у сэнсе нейкім, Быў за мяжой і я, Чаму ж, чаму ж...* (К. Камейша); *Маладыя гады... Залатыя гады... Але час не святы.* ***Арыштанцтва****, суды. І ты вораг народа, і гэты народ прад табою цяпер, як з калючкамі дрот* (В. Шніп); *– А мы, Аўдоля, Богам беражоны, От тутака сядзім, на ўскраі зоны. З'ядае радыяцыя здароўе. На вуліцы глушэча,* ***бескароўе*** (М. Мятліцкі); *Сум – нацыяналіст. Душа – касмапалітка. Радзіма – незачыненая хата. Шпачыны шчыры свіст І туманкова світка* ***Блуканцу*** *нагадаецца зацята* (Р. Барадулін); *Быццам* ***бязгрыб'е*** *ў лесе, Па вераснёўскай сушы, без вечарынак і песень Вёска маўклівасцю глушыць* (В. Зуёнак); *Міленіум, мяжа тысячагоддзяў, – Свет верыць цудам і наіўным снам... А нам яно ні кропелькі не шкодзіць – Усё, што мелі, застаецца нам: А праваслаўе, з'едзенае моллю, І нацзачыстак хіжае нутро, І мовы іншамоўнае* ***бязмоўе*** *– Як антыбеларускае таўро...* (В. Зуёнак); *Вышынёю арол жыве,* ***Вывівастасцю*** *– змей пачатку* (Р. Барадулін); *Хоць спадзе з абрысаў імгла, Ды спасцігнуць ніхто не ўмее І на небе дарогі арла, На скале –* ***высцяжыны*** *змея* (Р. Барадулін); *У ГУЛАГУ на іх* (бандзюг) *ураджайна. А бандзюга ж –* ***гулажніку*** *друг* (П. Пруднікаў); *Выдых адзін – з мільярдаў губ, З соплаў ракет, З выхлапных труб, З* ***дыманосных*** *усіх каміноў* (М. Мятліцкі); *Што вожыкаўская класіка, Калі ён сатыры леў?! Выкрываў* ***запарожцаўласнікаў****, Пакуль персанальнай не меў!..* (А. Лойка); *Ён піхаў у* ***запісоўку*** *Нейкі мой пушчанскі жарт. Млела божая кароўка На лязе яго нажа* (К. Камейша); *Цяпер душа не варта ні граша, Хаця яна – то воблачка над садам, То неабдымная, нібы* ***зямшар*** (Р. Тармола-Мірскі); *У галалёд гляджу, як па катку Ляціць машына хуткай дапамогі. Магчыма, да* ***інфарктніка****-нябогі: Вісіць яшчэ ў яго на валаску апошняе зязюльчына «ку-ку»* (М. Маляўка); *Ці настаўніца, ці мантажніца – На спусцелым няўтульным пляжы Загарае адзіная* ***пляжніца****, Покуль прыцем нячутна ляжа. Падступае вада да берага І на міг замірае быццам, І навокал ніводнага смелага, Каб да* ***пляжніцы*** *хваляй прыбіцца* (М. Шабовіч); *Помню, йшоў юбілей. Мы цяпер* ***юбілеім*** *зачаста...* (У. Верамейчык); *Апад ужо усчаўся жалудовы, Ужо сціхаў паўсюль* ***яблыкапад*** (К. Камейша);

4) выдуманыя рэаліі, у тым ліку:

а) міфічных істот: ***зарапас*** ‘той, хто пасе зоры‘, ***касмаед*** ‘паядальнік касмічных аб'ектаў‘, ***німфы-лясоўны*** ‘німфы, якія ўвасабляюць лес‘, ***цыклонацыклопы*** ‘цыклопы, якія параджаюць цыклоны‘: *Што будзе на зямлі? Не будзе нас! Адступіўся ў павечнае «былое». Наш грозны век – пахмуры* ***зарапас*** *– Знямее пад касмічнаю імглою* (М. Мятліцкі); *У смутку я, У смутку ўся Еўропа, Па ўсёй зямлі Жалобы чорны след: Цыклоп, Як тую бэру, Сонца злопаў... Хіба ж не дашагуб, Не* ***касмаед****?.. А над зямлёй – Залеўныя цыклоны Цыклопам ва ўнісон гудуць, гнятуць. О хіжыя цыклоны і цыклопы, Калі ж вас антыродзічы змятуць?..* (М. Чарняўскі, ***Цыклонацыклопы***); *Ты жывеш у суседнім Сусвеце, Дзе русалкі, дзе* ***німфы-лясоўны*** (М. Шабовіч);

б) выдуманыя хваробы: ***вінакардыя*** ‘пастаянная цяга да віна‘, ***хімадышка*** ‘адышка, выкліканая хімікатамі‘: *У забягайлаўцы зімой Максім схапіў* ***вінакардыю****. І з той пары згубіў спакой, І ходзіць быццам сам не свой, І ад хваробы злосна вые* (У. Верамейчык); *І помню – рукою замнога бяром, І свет –* ***хімадышкаю*** *хворы* (М. Мятліцкі);

в) фантастычныя прадметы: ***болеадвод*** ‘прылада, якая служыць для аховы ад болю‘, ***болесховішча*** ‘месца, дзе захоўваецца боль‘, ***дзівалёт*** ‘казачны касмічны карабель‘, ***квадракола*** ‘прадмет, які спалучае ўласцівасці квадрата і кола‘, ***святлалёт*** ‘казачны касмічны карабель для палёту да святла (зорак)‘: *Ён сапраўды быў яснага неба, Гэта ж бывае не кожны год... Громаадводаў болей не трэба! Людзі, прыдумайце* ***болеадвод*** (Р. Тармола-Мірскі); *І лежбішча тут і ратовішча. Дык беражы нас Бог. А дзе ж ты маё* ***болесховішча****? А крыху глыбей, чым мой боль* (К. Камейша); *О, каб меўся* ***дзівалёт*** *У дзядка, што стрэціў, Паляцелі б у палёт Без аглядкі дзеці* (У. Паўлаў); *Страпянуўся* ***святлалёт****, Нібы бант у косах, І праз воблакаў сумёт Паляцеў у космас* (У. Паўлаў); *Як спалучыць з квадратам круг, Каб везла* ***квадракола*** *Зямной фурманкі вечны дух І мой дагмат вясёлы?..* (В. Зуёнак).

МГПУ им. И.П.Шамякина

**Вывады**

Як паказвае фактычны матэрыял з мовы сучасных беларускіх паэтычных твораў, індывідуальна-аўтарскія неалагізмы не пазбаўлены ўласна намінатыўнай функцыі. Паэты нярэдка ўтвараюць новыя словы для назвы новай рэаліі або для перайменавання старой. Аналіз індывідуальна-аўтарскіх словаўтварэнняў дазваляе вылучыць паводле намінацыі чатыры групы індывідуальна-аўтарскіх неалагізмаў:

а) назвы новых рэалій, якія не маюць яшчэ намінацыі ў мове ***(баба-самасёлка, палітаматар)***;

б) намінацыі выдуманай асобы, прадмета, з'явы, якіх на самой справе не існуе ***(дужасіл, кавярніца, нікацінства)***;

в) абазначэнне рэаліі, асобы, прадмета, якія да гэтага часу абазначаліся ў мове апісальнымі канструкцыямі ***(арыштанцтва, бязгрыб'е, вывівастасць)***;

г) перайменаванне рэаліі, якая мае намінацыю ў мове (калі аказіянальнае слова становіцца сінонімам узуальнага ***(болеадвод, касмаед, квадракола)***).

Адзначым, што ўласна намінатыўная функцыя не з'яўляецца галоўнай і спалучаецца, як правіла, з іншымі функцыямі.

***Літаратура***

1. Лыков, А. Г. Современная русская лексикология (русское окказиональное слово) / А. Г. Лыков. – М. : Высш. шк., 1976. – 119 с.

2. Намитокова, Р. Ю. Авторские неологизмы: словообразовательный аспект / Р. Ю. Намитокова. – Ростов н/Д : Изд-во РГУ, 1986. – 156 с.

3. Земская, Е. А. Язык как деятельность. Морфема. Слово. Речь / Е. А. Земская. – М. : Языки славянской культуры, 2004. – 688 с.

4. Миронова, Н. А. Словотворчество в произведениях поэтов-модернистов 80–90-х гг. XX в. : автореф. ... дис. канд. филол. наук : 10.02.01 / Н. А. Миронова ; Орловский гос. ун-т. – Орел, 2002. – 21 с.

5. Бышук, О. П. Типы и функции новообразований в творчестве С. Кржижановского : автореф. ... дис. канд. филол. наук : 10.02.01 / О. П. Бышук ; Ярославский гос. ун-т. – Ярославль, 2008. – 22 с.

6. Грищева, Е. С. Структурно-семантическое и функциональное описание лексических окказионализмов в рамках теории элокутивного поля : автореф. ... дис. канд. филол. наук : 10.02.01 / Е. С. Грищева ; Алтайский гос. ун-т. – Барнаул, 2006. – 19 с.

***Summary***

The article examines individual author's neologisms which realize proper nominative function in the texts of modern belarussian poetry. They call a) new reality, b) invented person, subject, phenomenon, c) reality which hadn't one-word denomination, d) and they are synonyms of usual word.

*Паступіў у рэдакцыю 19.02.09.*

МГПУ им. И.П.Шамякина